Сосна, У. А. Навуковая спадчына А.П. Ігнаценкі / У. А. Сосна // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 99–103

***У. А. СОСНА***

# НАВУКОВАЯ СПАДЧЫНА А. П. ІГНАЦЕНКІ

Аляксандр Пятровіч Ігнаценка нарадзіўся 10 студзеня 1932 г. у вёсцы Студзянец Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Перажыў і захаваў цяжкую памяць пра вайну і галодныя пасляваенныя гады. У 1955 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а ў 1958 г. — аспірантуру. Уся навуковая, педагагічная і грамадская дзейнасць А. П. Ігнаценкі звязана з гістарычным факультэтам БДУ, кафедрай гісторыі Беларусі, дзе ён паслядоўна прайшоў усе ступені працоўнай кар'еры, пачынаючы са старшага лабаранта. У 1963 г. тут абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1976 г. — доктарскую (зацверджана ў 1978 г.). З чэрвеня 1980 г. — прафесар. У 1966—1975 гг. быў намеснікам дэкана спачатку завочнага, а потым гістарычнага факультэта. З 1975 па 1978 г. выконваў абавязкі, а ў 1989—1994 гг. загадваў кафедрай гісторыі Беларусі.

А. П. Ігнаценка з'яўляўся старшынёй праблемнага навуковага савета універсітэта па гісторыі Беларусі, членам, а раней і вучоным сакратаром, намеснікам старшыні спецыялізаванага савета універсітэта па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый у галіне гістарычных навук. Ён неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі рэктарата і мясцкома універсітэта, Граматай і Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, значком «За выдатныя поспехі ў рабоце вышэйшай адукацыі СССР».



У даследчыцкім плане А. П. Ігнаценка распрацоўваў пытанні сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі другой паловы XVII—XVIII ст. Аб гэтым сведчаць назвы апублікаваных ім манаграфій, зборнікаў дакументаў, раздзелаў у навучальных дапаможніках: «Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII—XVIII вв.». Мн., 1963; «Русско-белорусские связи во второй половине XVII в.: сб. документов». Мн., 1972; «Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией (вторая половина XVII—XVIII вв.)». Мн., 1974; История БССР. Мн., 1981. Ч. 1; Гісторыя Беларусі. Мн., 1994, 1996 і інш. У вучэбна-метадычным плане яго інтарэсы сягалі шырэй, да агульных праблем айчыннай гісторыі і філалагічнай галіны ведаў: «Введение в историю БССР». Мн., 1965; «Древнерусский язык». Мн., 1968, 1970, 1977 (разам з Н. С. Мажэйкай); «Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейших времен до 1917 г.». Мн., 1977 (разам з У. Н. Сідарцовым). Пад яго кіраўніцтвам распрацоўваліся і выдаваліся праграмы па гісторыі Беларусі для студэнтаў гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў. Усяго вучоным апублікавана каля ста работ агульным аб'ёмам звыш 300 друкаваных аркушаў.

Прадметам зацікаўлення яшчэ пачынаючага навукоўца, што вылілася ў кандыдацкую дысертацыю, стала эвалюцыя гарадскіх рамёстваў у познафеадальную эпоху. Даследчык адзначыў рост рамесніцкай вытворчасці ў першай палове XVII ст., значную дыферэнцыяцыю асобных яе відаў. Ваенныя разбурэнні і ўзмацненне феадальнай эксплуатацыі выклікалі заняпад гарадскога рамесніцтва ў першай палове XVIII ст. Працэсы аднаўлення гаспадаркі Беларусі, у тым ліку і рамесніцкай вытворчасці, былі характэрны для другой паловы XVIII ст. Такая перыядызацыя гарадскога жыцця пацвярджаецца далейшымі даследаваннямі эканамічнай гісторыі гэтага часу.

Вядучае значэнне, як паказвае сабраны А. П. Ігнаценкам матэрыял, мелі традыцыйныя рысы рамёстваў, характэрныя для феадальных гарадоў. Ім прааналізаваны вызначальныя галіны рамесніцкай вытворчасці ў розных гарадах, функцыянаванне цэхавай арганізацыі, у тым ліку адносіны паміж майстрамі, падмайстрамі і вучнямі. Вызначаны чыннікі, што ўплывалі на рэгламентацыю рамесніцкіх вырабаў, апісаны шляхі іх рэалізацыі, праблемы канкурэнцыі з няцэхавымі рамеснікамі.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі прасочваецца працэс разлажэння цэхавай арганізацыі і зараджэння ў рамесніцкай вытворчасці элементаў капіталізму, што адносіцца да XVIII ст. і пераважна яго другой паловы. Сведчанне таму — арганізацыя буйных майстэрняў і прымяненне наёмнай працы. Аднак маштабы гэтай з'явы былі не такімі значнымі, каб гаварыць у



цэлым аб пераходзе рамяства, заснаванага на феадальных адносінах, да капіталістычных рамесных майстэрняў.

Пытанні беларуска-рускіх сувязей і грамадска-палітычная барацьба на беларускіх землях у другой палове XVII—XVIII ст. склалі сутнасць і змест доктарскай дысертацыі А. П. Ігнаценкі. У ёй даследчык засяроджваецца перш за ўсё на прадпасылках і прычынах гэтых з'яў: стане сельскай гаспадаркі і гарадской эканомікі, сялянскіх павіннасцях, становішчы сялян і гараджан, нацыянальна-рэлігійных супярэчнасцях.

Даследаванне паказала, што Рэч Паспалітая ў цэлым і Беларусь як яе складаная частка ў гэты час перажывалі эканамічны заняпад і глыбокі палітычны крызіс. Адсталае паводле тэхнічнага ўзроўню земляробства, падарваныя ваеннымі спусташэннямі гарадское рамяство, унутраны і знешні гандаль — усё гэта прывяло да таго, што калісьці ўрадлівыя землі зараслі хмызняком, а гарады, мястэчкі і вёскі пусцелі. Праўда, як сцвердзілі найноўшыя даследаванні, такая рэзкая ацэнка эканамічнай сітуацыі характэрна для перыяду да сярэдзіны XVIII ст., пасля чаго пачаўся цяжкі працэс паступовага гаспадарчага аднаўлення і ажыўлення. Агульныя ж высновы аб узмацненні феадальнага прыгнёту і нацыянальна-рэлігійнага ўціску не выклікаюць пярэчанняў.

Асноўная ўвага нададзена фактам сацыяльна-класавай і нацыянальна-рэлігійнай барацьбы, прычым яны разглядаюцца праз прызму адносін насельніцтва Беларусі да Расіі. У рамках такога падыходу разгледжаны ўцёкі сялян і гараджан у межы Расійскай дзяржавы і ва Украіну, напады сялян на феадальныя маёнткі, іх разбурэнні і падпалы, пакаранні аканомаў. Прасочваюцца сувязі беларускіх сялян з казацкімі атрадамі і сялянамі суседніх рускіх зямель, водгукі ў Беларусі на гайдамацкае паўстанне і «Каліеўшчыну», паўстанне пад кіраўніцтвам Сцяпана Разіна. Вялікую цікавасць уяўляюць апісанні буйных узброеных выступленняў сялян і гараджан у XVIII ст., перш за ўсё падзей у Крычаўскім старостве. Усё гэта зроблена на аснове разнастайнай базы крыніц, якая дазволіла істотна пашырыць нашы ўяўленні аб сацыяльна-палітычных працэсах у познафеадальным беларускім грамадстве.

Адметным з'яўляецца паказ палітычнай сітуацыі на беларускіх землях падчас паўстання 1794 г., бо яно лічылася з'явай польскай гісторыі і ў Беларусі не даследавалася. Прызнаючы, што паўстанне было падрыхтавана прагрэсіўнымі шляхецка-буржуазнымі коламі дзеля захавання самастойнасці Рэчы Паспалітай і правядзення ў жыццё рэформ, абвешчаных Чатырохгадовым соймам 1788—1792 гг., А. П. Ігнаценка заўважае неадназначныя адносіны да яго насельніцтва Беларусі, і асабліва сялянства, ад пазіцыі якога ў рашаючай ступені залежаў поспех паўстання. Выдадзены Касцюшкам 7 мая Паланецкі універсал абяцаў ім асабістую свабоду і некаторае змяншэнне



феадальных павіннасцей, аднак у рэальнасці застаўся на паперы. Асноўная маса шляхты і тым больш землеўладальнікі не былі гатовы да кардынальных крокаў у сялянскім пытанні. У сувязі з гэтым, лічыў даследчык, удзел беларускіх сялян у паўстанні абмежаваўся пераважна прымусовай іх мабілізацыяй. Пры першай магчымасці, асабліва з набліжэннем рускіх войскаў, яны беглі дадому. Прыводзяцца факты колькаснага прадстаўніцтва сялян у паўстанцкіх атрадах, заляцанняў да іх як шляхецкага кіраўніцтва, так і царскіх генералаў, якія, у сваю чаргу, імкнуліся выкарыстаць сялян у антыпаўстанцкіх мэтах. У шэрагу месц сяляне, скарыстаўшыся адміністрацыйнай неразбярыхай, ухіліліся ад выканання павіннасцей і нават грамілі панскія маёнткі. Паказваюцца паводзіны і той часткі сацыяльных нізоў, якія надзеі на паляпшэнне свайго становішча звязвалі са зменай дзяржаўнай прыналежнасці, выяўляючы наіўныя спадзяванні на царызм. Дзякуючы раскрыццю гэтых сюжэтаў, у гістарыяграфіі ўпершыню прагучаў беларускі кантэкст паўстання Тадэвуша Касцюшкі, так актыўна раскрываемы зараз гісторыкамі.

Жорстка крытыкуючы палітыку кіруючых колаў Рэчы Паспалітай, А. П. Ігнаценка не ідэалізаваў і расійскі царызм, які эксплуатаваў этнічную і рэлігійную блізкасць усходнеславянскіх народаў у сваіх вялікадзяржаўна-імперскіх мэтах. Ён не хаваў фактаў сацыяльнай салідарнасці феадальных вярхоў абедзвюх дзяржаў у падаўленні шырокамаштабных рухаў украінскага і беларускага сялянства. Прыведзены матэрыял сведчыць, што расійскі ўрад дзейнічаў вельмі асцярожна і ў звычайных (мірных) абставінах ніколі не рашаўся на адкрытае выкарыстанне і тым больш падаграванне тых унутраных канфліктаў, якія маглі б прывесці да змены сацыяльнага ладу Рэчы Паспалітай. Ён абмяжоўваўся ўлікам нацыянальна-рэлігійнага чынніка, мяркуючы, што сама розніца ў веравызнанні землеўладальнікаў і іх падданых ва ўсходніх рэгіёнах Рэчы Паспалітай забяспечыць пры неабходнасці падтрымку ўкраінскага і беларускага сялянства.

Такім чынам, А. П. Ігнаценка звязаў сацыяльна-класавую барацьбу на беларускіх землях з палітычным жыццём Рэчы Паспалітай, уключаючы і падзелы гэтай краіны суседнімі дзяржавамі. Праз пераважна новыя архіўныя дадзеныя выяўляецца палітычная роля народных нізоў у познафеадальны перыяд, што ўвогуле дае падставы для спецыяльнага вывучэння палітычнай гісторыі сялянства значна раней, чым яно было вызвалена ад прыгоннай няволі.

Безумоўна, пры абагульненні фактаў іншы раз не абыходзілася без катэгарычных высноў і стэрэатыпаў, характэрных для савецкай гістарыяграфіі. Такі быў час і ідэалагічныя ўмовы працы вучоных-гуманітарыяў. Здаралася, шаноўны прафесар уступаў у палеміку з калегамі па гістарычным цэху,



крытыкаваў і крытыкаваўся, высвятляючы спрэчныя пытанні нашай мінуўшчыны. Цікавіўся ўсім прынцыпова новым, што з'ўлялася ў беларускай гістарычнай навуцы. А яго публікацыі, ва ўсякім разе, нікога не пакідалі абыякавымі.

Аляксандр Пятровіч ніколі не хваліўся дасягненнямі, не выстаўляў іх напаказ. Але і не сумняваўся ў слушнасці абранага творчага шляху і дастойнасці свайго навуковага даробку. Іншая рэч, што не ўсе задумкі ўдалося ажыццявіць. Аб іх шматграннасці сведчаць пералічаныя вышэй працы, а таксама рукапіс кнігі аб падзеях Паўночнай вайны ў Беларусі, што яшчэ чакае свайго выдаўца. Плённы працяг на факультэце маюць яго пачынанні ў галіне крыніцазнаўства.

Спадчына вучонага працягваецца і нарошчваецца працай аспірантаў, якім ён перадаў свае навыкі і вопыт. 10 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі пад яго кіраўніцтвам. Іншым Аляксандр Пятровіч аказваў усемагчымае садзейнічанне. Прынцыповасць і добразычлівасць Настаўніка выклікае ўдзячнасць усіх яго вучняў.

Надзвычайная працавітасць, настойлівасць у дасягненні пастаўленай мэты, нязломнасць перад цяжкасцямі і нягодамі з’яўляюцца прыкладам для цяперашняга і наступных пакаленняў навукоўцаў.